**АБРАМЛЕННЕ ДЫЯЛОГУ ЯК ВІД САЧЫНЕННЯ**

***Шышова А. І.*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік*** *– А. В. Солахаў, канд. філал. навук, дацэнт*

Вялікую ролю для развіцця вуснага і пісьмовага маўлення малодшых школьнікаў адыгрывае выкарыстанне літаратурнага дыялогу як асновы для працы над сачыненнем абрамленнем. Абрамленне дыялогу разглядаецца як від сачынення, дзе дзеці, разважаючы, адлюстроўваюць свае думкі, меркаванні ў выглядзе інфармацыі пра ўдзельнікаў дыялогу, месца і час іх



МГПУ им. И.П.Шамякина

размовы. Для развіцця вуснага і пісьмовага маўлення малодшых школьнікаў, разумення імі зместу выказвання, выпрацоўкі неабходных мімікі і жэстаў выкарыстоўваюцца гатовыя дыялогі – цэласны літаратурны твор або толькі яго частка, якія могуць складацца з дзвюх і больш рэплік. Гэта могуць быць смяшынкі, дыялогі, урыўкі з драматычных і празаічных твораў. Каб даць вучням заданне – прыдумаць абрамленне дыялогу, настаўнік павінен памятаць аб тым, што аб'ём дыялогу залежыць ад узроставых асаблівасцей школьнікаў і ступені іх чытацкай і маўленчай падрыхтоўкі. У 2-м класе рэкамендуецца выкарыстоўваць 2–4 рэплікі, у 3-м – 4–6, у 4-м – 6–8 [1, с. 28]. Возьмем, напрыклад, для абрамлення дыялог з верша Авяр'яна Дзеружынскага "Пачаў лепш вучыцца" :

*– Ты пачаў, Ясь, лепш вучыцца і як след за кнігі ўзяўся.*

*– Дык ты ж ведаеш, бабуля, – тэлевізар сапсаваўся.*

Пры падрыхтоўцы да сачынення-абрамлення неабходна правесці з вучнямі гутарку па наступных пытаннях:

– Хто ўдзельнічаў у размове?

– Як вы здагадаліся, што размаўлялі бабуля і яе ўнук?

– Калі адбывалася размова?

– Каму належаць словы "*Ты пачаў, Ясь, лепш вучыцца і як след за кнігі ўзяўся*"?

– Каму належаць словы *"Дык ты ж ведаеш, бабуля, – тэлевізар сапсаваўся"*?

Вось адзін з прыкладаў сачынення.

*Ясь прыйшоў са школы. Дома была яго любімая бабуля. Хлопчык пахваліўся ёй сваімі адзнакамі. Бабуля запрасіла яго за стол і сказала:*

*– Ты пачаў, Ясь, лепш вучыцца і як след за кнігі ўзяўся.*

*– Дык ты ж ведаеш, бабуля, тэлевізар сапсаваўся, – адказаў унук.*

*Бабуля толькі ўсміхнулася.*

**Літаратура**

1 Солахаў, А. В. Дыялог як сродак развіцця маўлення малодшых школьнікаў на ўроках роднай мовы / А. В. Солахаў// Беларуская пачатковая школа: праблемы і перспектывы развіцця: матэрыялы VI Міжнар. навук.-практ. канф., 17–18 кастр. 2007 г. – Мазыр, 2007. – С. 27–28.

МГПУ им. И.П.Шамякина